**Сутула, Г.** Апошняя вышыня / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2010. — 13 лютага. — С. 3.

# АПОШНЯЯ ВЫШЫНЯ



**Саша, Лёня, Дзіма, Раман... Яны, дзеці сялян, змалку вучыліся касіць і араць, адбывалі радоўкі і пасвілі коней, бегалі за грыбамі і ягадамі ў недалёкі лес, летняй спякотай з задавальненнем плёскаліся ў рачулцы.**

**Як усе хлапчукі, гулялі «ў вайну»: адважна хадзілі ўрукапашную і ў «разведку», бралі ворага ў «палон». Хто з іх мог надумаць тады, што вайна, якую распаліла людская варожасць за тысячы вёрст ад працаўніцы-Беларусі, загадае ім стаць у баявы строй і ўжо не з драўляным, а з сапраўдным аўтаматам прыйдзецца адваёўваць у смерці права на жыццё. Смерць многім не даравала падобнага смелага выкліку: тысячы крывавых кропак паставіла яна, бессардэчная, на лёсах салдат, для якіх афганская вышыня стала апошняй у жыцці.**

***Зоркі не на пагонах***
***В горячих песках, как в жизни,***
***всё шатко и зыбко,***
***От друга лишь тело осталось,***
***года и на фото улыбка.***
***Стреляет в упор***
***в душу боль этой утраты***
***Вот так, по приказу,***
***в вечность уходят солдаты...***

Пяцёра хлопцаў з Глыбоцкага раёна назаўсёды засталіся ў вечнасці.

Глыбачанін Дзмітрый Батура скончыў СШ №1, вучыўся ў тэхнікуме, працаваў слесарам у райсельгастэхніцы. У 1983 годзе прызваны ў армію, а праз год, не дажыўшы месяц да дваццацігоддзя, загінуўу Афганістане. Ён не хапаў зорак з неба, быў радавым салдатам, але тую

адзіную, зорку героя, ён заслужыў коштам свайго маладога жыцця: ордэнам Чырвонай Зоркі Дзмітрый узнагароджаны пасмяротна.

Спякотны жнівень 1984-га стаў апошнім у біяграфіі Аляксандра Чаронкі з вёскі Завулак. Бой у кішлаку ўспыхнуў, як запаленая сярнічка. Без перапынку стракатаў кулямёт. Ад напружання Сашу здавалася, што рукі зрасліся са зброяй. Усяго трэць хвіліны і адной кулі хапіла, каб сэрца перастала біцца. У далёкай глыбоцкай глыбінцы, памаліўшыся за сына, клаліся спаць бацькі. А ў гэты час на гарачым пяску чужой зямлі астывала яго яшчэ нядаўна жывое цела. Малодшаму сяржанту Аляксандру Чаронку не было і дваццаці гадоў.

Чырвоная Зорка ордэна апусцілася на яго надмагільны помнік.

«Салдат на дэмбель», – так пісаў пра сябе Аляксандр Дзегцяроў з Перадол. Будучы педагог ужо планаваў будучае. А ў маі, белым ад кіпучай квецені, ён загінуў пры размініраванні дарогі.

Раман Мацяюн быў прапаршчыкам звыштэрміновай службы. У Афганістан трапіў у 1987 годзе. Самалёт з папаўненнем падняўся ў неба з Кабульскага аэрадрома, але да месца прызначэння не даляцеў. Знішчальная ракета «Стынгер», выпушчаная душманамі, абарвала дзесяткі жыццяў ваеннаслужачых.

Усіх іх прыняла і па-мацярынску прытуліла родная зямля...

**Бацька і сын**

Веньямін Паўлавіч Сандзюк да цяперашняга жыве ў Стуканах. У гэтай вёсцы ён знайшоў сваю Галіну, ажаніўся, дом паставіў. Тут, у вясковай хаце, нараджаліся і падрасталі дзеці. Сюды сын Лёня, які вучыўся ў Ільянскім саўгас-тэхнікуме, прывозіў нявесту Алу. Адсюль у сакавіку 1981 года ён пайшоў у армію. І Ала ехала на праводзіны, але так і не сустрэлася з каханым. Якраз у той дзень аўтобус на Стуканы не пайшоў, і дзяўчына вярнулася дадому. Чаму лёс не дазволіў ім сустрэцца? Магчыма, не хацеў, каб Ала засталася ўдавой.

– Лёня спачатку служыў у Мар'інай Горцы, затым трапіў у Туркменістан, а летам 1981-га ён ужо быў у Афганістане, – расказвае Веньямін Паўлавіч. – У снежні пісаў: «Стаім высока ў гарах. Ахоўваем аб'ект. Відаць, тут і прыйдзецца сустракаць Новы год». У студзені 1982 года у Стуканы даляцела такое пісьмо: «Новы год сустракалі без снегу, пры тэмпературы +60. Гэты год мне запомніцца на ўсё жыццё». Чаму – не напісаў, але маё сэрца адчувала, што не даслужыць ён...

У лютым 1982 года Леанід Сандзюк пісаў: «Зняліся з гор. Жывём у палатках. Днем плавімся ад спякоты, а ноччу мерзнем». А затым настала нямая цішыня без адзінай вестачкі. Чорнымі начамі да бацькі прыходзілі сны. Колькі разоў ён, нібы сам быў у Афгане, бачыў, як хлопцы ідуць у атаку, ведаў, што і Лёня там, але ні разу з ім не сустрэўся.

– А аднаго дня іду з работы, а насустрач жонка са слязьмі: «Лёнечку забілі. Сыночка вязуць». У той момант мне здалося, што зямны шар перакуліўся дагары нагамі.

Затым прыйшло паведамленне з часці. Камандзір пісаў, што Леанід Сандзюк загіну; ратуючы сяброў і выносячы з жару боепрыпасы. Пазней у кнізе «Памяць» бацькі прачыталі, што Лёня быў цяжка паранены ў час артылерыйскага абстрэлу і памёр ад ран у шпіталі.

Не лёгка было на душы ў бацькі. Маўклівы і пануры сустракаў ён цынкавую дамавіну. З дому, у якім Лёня рабіў першыя крокі, яго і адправілі ў скорбны шлях. Могілкі, акружаныя лесам, суседнічалі з вёскай. Недалёчка было бацькам хадзіць да сына. Напачатку па некалькі разоў на дні адведвалі яго.

Па снежнай цаліне мы з Веньямінам Паўлавічам ідзём на могілкі.

– Тут – Лёня, злева – маці, а справа – маё месца, – тлумачыў стары. – Хутка ўсе разам тут збяромся.

***

Вот так захотела судьба,

Никак от неё не сбежать.

Уйдёт, думал он, на чуть-чуть

А им в чёрном век доживать.

Цяпер у Веньяміна Паўлавіча ёсць унукі і праўнукі, але ж ўсе яны «на свеце».

– Адзін Лёня дома застаўся,і ў бядзе,і ў хваробах,і старасці ён са мной.

Сын і бацька. Бацька і сын. І жыве памяць, балючая, вострая, крывавая, але такая неабходная для таго, каб не дапусціць новых войнаў.

**Г. Сутула**

*НА ЗДЫМКУ: Веньямін Паўлавіч на магіле сына*

*Фота Уладзіслава Бары*